# КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

**Выстава «Балады аб мужнасці», прымеркаваная да галоўнага свята нашай краіны – Дня Незалежнасці і 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, – працуе ў Нацыянальнай бібліятэцы. Гэта частка маштабнага праекта «Колеры Вялікай Перамогі» Беларускага саюза мастакоў прапануе асэнсаваць хвалюючую для многіх пакаленняў тэму праз вобразы, створаныя яшчэ ў 1960–80-х.**
**Адначасова раім пацікавіцца ў бібліятэцы кніжнымі навінкамі – яны дазволяць нырнуць у безліч падзей, сітуацый, прасачыць хітраспляценні рэальнага з міфічным, дакументальнага з дэтэктыўным.**

Сюжэты Вялікай Айчыннай не пакідаюць у спакоі сучасных майстроў слова. Вось і аршанскага пісьменніка **Канстанціна Нілава** трывала трымае ваенная тэматыка. Спачатку ўвагу прыцягнула яго дакументальная «Копысская новелла» – пра подзвіг удзельнікаў партыйна-камсамольскага падполля і партызанскага руху ў пасёлку Копысь Аршанскага раёна, уклад землякоў у агульную Перамогу.




Сёння чытачы зацікавіліся раманам Нілава **«Горькая страсть полонеза Огинского»** ў дзвюх частках. Пакуль знайшла толькі першую – пад паэтычнай назвай «Вкус рябины лесной». Але, як можна здагадацца, аўтар піша не пра харство прыроды. Яго твор пагружае ў вірлівыя падзеі на пачатку Другой сусветнай вайны, расказвае пра нялёгкія будні савецкай разведкі і контрразведкі.

У цэнтры ўвагі – лёсы людзей, якія нечакана апынуліся ў надзвычайных ваенных сітуацыях: на чужыне, у лагерах. Як праяўляецца іх характар, пра што думаюць – усё гэта цікавіць аўтара. Пытанні, якія не даюць спакою героям рамана, няпростыя, але патрабуюць адказу і разумення. З болем у голасе ўсклікае адна з гераінь рамана, старшая медсястра хірургічнага аддзялення Зоя Васільеўна: «І як нашы штабісты маглі дапусціць такое, каб не прадбачыць гэты раптоўны напад немцаў? Парады сумесныя ў Брэсце рабілі, шампанскае на дыпламатычных сустрэчах пілі, а самі не бачылі побач такога каварнага ворага».




Падзеі ж рамана-версіі вядомага літаратара **Уладзіміра Гаўрыловіча «Любі бліжняга свайго…»** пераносяць чытача то ў сучаснасць, то ў мінулае: яны адбываюцца ў 2022 і 2023 гадах у Беларусі і Расіі і дзесяць стагоддзяў таму ў Кіеўскай Русі і Тураўскім княстве. Твор стаў працягам вядомага рамана «Па веры вашай…», які летась адзначаны Нацыянальнай літаратурнай прэміяй.

Гаўрыловіч разважае пра катэгорыі важныя, фундаментальныя. Паводле аўтара, нават у самыя страшныя хвіліны кожны чалавек мае права выбіраць, перад кожным адкрываюцца мінімум два шляхі. Хіба не гэта самая невычэрпная для пісьменніцкіх даследаванняў і разваг тэма? Сумленне і здрада, вера і яе адсутнасць, загінуць з гонарам або жыць са страхам выкрыцця – што выбіраюць у розных сітуацыях героі новага рамана-версіі? «Ведаеш, сынок, напэўна, Гасподзь так запланаваў для цябе, столькі выпрабаванняў, каб ты ўрэшце стаў чалавекам, – кажа адзін з іх. – Але пасля ўсяго, што здараецца, абавязкова прыходзіць новы дзень. Дай Бог, каб ён у цябе быў без памылак». Уладзімір Гаўрыловіч валодае бясспрэчным талентам пранікнуць у сутнасць чалавечай душы, у прычыны тых ці іншых рашэнняў і ўчынкаў. Кожным радком аўтар быццам падштурхоўвае да гуманістычнай высновы: усе мы ёсць і будзем жыць дзеля шчасця, а не для таго, каб вынішчаць сабе падобных.

*Кнігі для агляду прадастаўлены Прэзідэнцкай бібліятэкай Рэспублікі Беларусь.*

У пэўным сэнсе гістарычны (але ўсё ж такі і дэтэктыўны) раман вырваў мяне суботнім вечарам з рэчаіснасці. Захапіла **«Ожерелье из Финикии, или Три тысячи лет преступлению» Віктара Крукоўскага**. Яго пяру належаць добрыя, карысныя і для дзяцей, і для дарослых творы, напрыклад краязнаўчыя казкі.




У рамане аўтар у ролі следчага на пенсіі прасочвае лёс загадкавых караляў – містычнага артэфакта, вакол якога цягам тысячагоддзяў развіваліся таемныя падзеі. Прага нажывы, самаахвярнасць, жорсткасць і міласэрнасць, вераломства і адплата, нянавісць і любоў інтрыгуюць ад першай старонкі. Сюжэт пачынаецца са справы № 1 часоў ад другога тысячагоддзя да новай эры – «Аб разбойным нападзе на дом рамесніка Эніёна з Сідона, яго забойстве і выкраданні належачых яму каштоўнасцей», а заканчваецца распачатай у 1992-м справай № 8 «Аб забойстве жыхароў вёскі Студзёнкі Пелагеі Сямёнаўны і Рыгора Васільевіча Кузьмічовых». Чым завяршыліся страсці вакол караляў і адной рубінавай пацерачкі, якая засталася ў следчага насуперак усім законам і правілам, не патрапіўшы ў лік рэчавых доказаў? І ці даведаемся напрыканцы, дзе тая каштоўнасць цяпер?

Па-майстэрску спалучае рэальнае з містычным яшчэ адзін аўтар, з творчасцю якога пазнаёмілася не так даўно. Зборнік твораў малога жанру **«Калі чужая душа – твая» Віктара Кунцэвіча** пачынаецца аповесцю «Што падкажа сэрца…». Па назве ўжо можна рабіць выснову, што тут не столькі пра каханне, а пра адказнасць, памылкі і рашэнні, якія цяжка прыняць. Аўтар, дасягнуўшы пэўных вяршынь на ніве паэтычнай, таленавіта «закруціў» некалькі цікавых сюжэтаў у прозе – аповесцях, апавяданнях ды жыццёвых згадках (абразках). У кожным адчуваецца дапытлівасць і назіральнасць творцы, яго шчырасць, дабрыня і гумар. Творы здзіўляюць жыццёвай мудрасцю, любоўю да ўсяго жывога (хоць да вароны, хоць да парсючка), выразнасцю трапна прыкмечаных дэталей. Пачытаеш абразок «Спецыяліст па свіннях» – і схамянешся: во жыццё змянілася! Ну праўда, хто сёння ведае, што свіней некалі пасвілі?! Затое за літаратурнымі героямі цікава і весела назіраць, разам з імі здзіўляцца і перажываць за іх.




Бадай, усе пакаленні пісьменнікаў у розных краінах, асэнсоўваючы рэчаіснасць, з павагай ставяцца да фальклорна-міфалагічнай спадчыны, вывучаюць яе. Дзякуючы гэтаму творцы глыбока даследуюць цесную сувязь паміж чалавекам і Сусветам. Дарэчы будзе згадаць раман Габрыэля Гарсіі Маркеса «Восень патрыярха», «Буранны паўстанак: і вякуе дзень даўжэй за век» Чынгіза Айтматава, знакамітую казку «Сярэбраная табакерка» Змітрака Бядулі…




Сучаснікі таксама спрабуюць разабрацца ў мінулым і спрадвечным. Добры таму прыклад – аповесць **Алеся Кажадуба «Лесавік» у зборніку «Цені дзікага палявання»**. Твор пераконвае ў тым, што ментальнасць беларуса засноўваецца на яго еднасці з прыродай, пра што, уласна, сведчаць найперш старадаўнія міфы. Нават добра вядомы нашым прашчурам лесавік здольны дапамагчы асэнсаваць спрадвечныя ісціны. «Для лесавіка гэта зямля, зямля ў атачэнні рэк і балот, зямля з дубовымі гаямі і сасновымі барамі, з чыстымі бярэзнікамі і шапатлівымі ельнікамі была найлепшая, хаця іншай зямлі ён і не ведаў».

Прыемнага чытання!

***Рубрыку вядзе Святлана ПРОТАС***



*Кнігі для агляду прадастаўлены Прэзідэнцкай бібліятэкай Рэспублікі Беларусь.*